могут применяться как промежуточный инструмент изучения поэтики текста, литературной ономастики и других аспектов литературного творчества.


1. Беляцкая, В.В. Функции топонимов как составляющей идиостиляБернвардаВеспера / В.В. Беляцкая, Л. И. Пастушенко // Современная наука: актуальные проблемы и пути их решения. – М., 2014. – №9. – С. 116-119.
2. Ковалев, Г.Ф. Избранное. Литературная ономастика / Г.Ф. Ковалев. – Воронеж :Науч.кн., 2014б. – 447 с.
3. Марунич, И.И. Топонимы в идиостиле писателя: автореф. дис. … канд. филол. наук:10.02.01 / И.И. Марунич. – Киев, 1993. – 18 с.
4.Мезенко, А.М. Теория имени собственного : учебное пособие для студентов учреждений образования по специальности магистратуры "Языкознание" / А.М. Мезенко, В.М. Генкин, А.Н. Деревяго ; под общ.ред. А.М. Мезенко ; М-во образования Республики Беларусь, Учреждение образования "Витебский государственный университет имени П.М. Машерова". – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – 201 cURL:https://rep.vsu.by/handle/123456789/31393(дата обращения:07.09.2022)
5. Отин, Е.С. Стилистические функции собственных имен в рассказах В.М. Гаршина/ Е.С. Отин // Избранные труды по языкознанию. – Донецк : «Донеччина», 1999. – С. 145-154.
6. Прищепа, М.М. Топонимы в литературном пространстве сборника рассказов о Шерлоке Холмсе Артура Конан Дойла / М.М. Прищепа // На пути к гражданскому обществу. – Иваново: Ивановский филиал ЧОУ ВО «Институт управления», 2022. – №2 (45). – С. 84 – 89.
7. Страхов, И.И. Малая родина в художественном творчестве М.М. Пришвина: ономастический комментарий / И. И. Страхов // ФИЛОLOGOS. – Елец : ЕГУ им. И.А. Бунина,2015. – №3 (26). – С. 73-77.
8. Супрун, В.И. Ономастическое поле русского языка и его художественноэстетический потенциал: дис. ... д-ра филол. наук в форменауч. докл.: 10.02.01 / В.И. Супрун. – Волгоград, 2000. – 76 с.
9. Фонякова, О.И. Имя собственное в художественном тексте: учебное пособие / О.И. Фонякова. – Л.: ЛГУ, 1990. – 103 с.


## ПРЭЦЭДЭНТНЫЯ ФЕНОМЕНЫ ЛІТАРАТУРНАГА ПАХОДЖАННЯ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКАМОЎНЫМ МЕДЫЯДЫСКУРСЕ


***Пятрова Д.С.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Півавар К.С.,** кандыдат філал. навук, дацэнт*



Ключавыя словы. Тэорыя прэцэдэнтнасці, прэцэдэнтны тэкст, прэцэдэнтнае імя, прэцэдэнтная сітуацыя прэцэдэнтнае выказванне, медыядыскурс.

Keywords. Precedent theory, precedent text, case name, precedent situation, case statement, media discourse.


Вывучэнне прэцэдэнтных феноменаў спрыяе развіццю міжнароднай камунікацыі, перакладу, культурнай пісьменнасці. Актуальнасць нашага даследавання тлумачыцца тым, што з пазіцыі інтэртэкстуальнасці і прэцэдэнтнасці беларускі публіцыстычны дыскурс практычна не апісаны. З’ява прэцэдэнтных феноменаў найбольш прадстаўлена ў мастацкіх тэкстах і публіцыстыцы. Менавіта з гэтым звязана ўвага вучоных да аналізу вывучэння прэцэдэнтных феноменаў як значных мадэлей адлюстравання культуры ў мове літаратуры. Асноўныя палажэнні катэгорый прэцэдэнтнасці і інтэртэкстуальнасці сфармуляваны ў працах М.М. Бахціна, Ю.М. Лотмана, Ю.М. Каравулава, у даследаваннях Н.А. Фацеевай, Д.Б. Гудкова, Н.А.Кузьміной і інш. Мэта нашага даследавання – выяўленне і вывучэнне прэцэдэнтных феноменаў у беларускамоўным публіцыстычным дыскурсе.

**Матэрыял і метады.** Прадметам увагі з’яўляюцца заканамернасці ўжывання прэцэдэнтных феноменаў літаратурнага паходжання ў беларускамоўным публіцыстычным дыскурсе. У працэсе даследавання знайшлі прымяненне апісальны, параўнальны і аналітычны метады. У працэсе выяўлення моўнай рэпрэзентацыі прэцэдэнтных феноменаў у беларускім публіцыстычным дыскурсе даследаваны матэрыял беларускага інфармацыйнага партала zviazda.by за 2021–2022 гг. Аб’ект даследавання – кантэксты з прэцэдэнтнымі феноменамі літаратурнага паходжання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Прэцэдэнтныя феномены – гэта шматфункцыянальныя адзінкі, у адной камунікатыўнай сітуацыі, якія часта праяўляюцца. Аднак пры працы з такімі адзінкамі варта ўлічваць іх галоўную асаблівасць – парольнасць, якая абумоўлівае рэалізацыю ўсіх астатніх функцый [1, с. 70].

В.В. Красных, ствараючы тэорыю прэцэдэнтных феноменаў, якая разглядаецца як далейшы шлях вывучэння прэцэдэнту, адабрала такую сістэму: прэцэдэнтныя тэкст, імя, выказванне, сітуацыя [2, с. 130].

Прэцэдэнтны тэкст – гэта закончаны і самастойны прадукт моўнай дзейнасці, прэдыкатыўная адзінка. Да ліку прэцэдэнтных тэкстаў належаць творы мастацкай літаратуры, тэксты песень, рэкламы. Тэкст пераўтвараецца ў прэцэдэнтны, толькі калі ён ўжываецца і тлумачыцца не даслоўна, а ў ролі рэсурса сімвалізацыі ўсялякай абстаноўкі па-за сувязі з прысутнасць пачатковага тэксту, г. зн. «дзейнічае» аналагічна прымаўкам, прыказкам, фразеалагізмам і г. д. Напрыклад, «“Калі навука пойдзе туга, паможа бацькава папруга…”» (газета «Звязда» 29 студзеня 2021 г., стар. 21) – радкі з твора Я. Коласа «Новая зямля»; «Нам засталася спадчына…» (газета «Звязда» 6 мая 2021 г., стар. 4) – радкі з верша Я. Купалы «Спадчына»; «З першых яго старонак аўтар звяртаецца да ўжо вядомай у літаратуры тэмы трагедыі беларускіх вёсак. Як не прыгадаць тут “Хатынскую аповесць” Алеся Адамовіча?» (газета «Звязда» 4 лютага 2021 г., стар. 15) – аповесць А. Адамовіча, якая прысвечана барацьбе партызан супраць нямецкіх акупантаў у Беларусі падчас Вялікай Айчынай вайны; «Людзі на балоце» (газета «Звязда» 21 студзеня 2021 г., стар. 14) – назва артыкула пра працу людзей у калгасе, дзе кругом адно балота і пясок, такая ж самая, як і назва з рамана «Палеская хроніка» – «Людзі на балоце»; «Многія, чытаючы пра блуканні герояў па беларускіх балотах і здзіўляючыся іх майстэрству выжывання, успомняць “Палескіх рабінзонаў” Янкі Маўра.» (газета «Звязда» 4 лютага 2021 г., стар. 16) – твор Я. Маўра распавядае пра дзіўныя прыгоды двух маладых людзей, Віктара і Мірона, якія гатовыя прыйсці на дапамогу.

Ужываюцца радкі таксама з твораў рускай літаратуры: «Нават у студзені ў нас замест снегу ідзе дождж, а замест “марозу і сонца” – “туман і золь”.» (газета «Звязда» 8 студзеня 2020 г., стар. 3) – радкі з верша А. С. Пушкіна «Морозное утро»: «Мороз и солнце; день чудесный!».

Значнае месца ў публіцыстычным тэксце займаюць семантычна мадыфікаваныя прэцэдэнтныя тэксты, якія лёгка ўгадваюцца чытачом, адгукаюцца ў яго памяці, а значыць, прыцягваюць увагу і запамінаюцца. Напрыклад, «Апошняе паляванне князя Казіміра» (газета «Звязда» 26 студзеня 2021 г., стар. 8) – загаловак артыкула складзены па прыкладзе твора «Дзікае паляванне караля Стаха» У. Караткевіча. У радках «дайце чалавеку рыбу, і ён цэлы дзень будзе пад’еўшы, дайце яму вуду, і ён усё жыццё і ўсіх будзе дастаўляць сваімі рыбацкімі прыгодамі» (газета «Звязда» 24 сакавіка 2021 г., стар. 6) гумарыстычна пераасэнсаваны афарызм Канфуцыя “Дай чалавеку рыбу, і ты накорміш яго на цэлы дзень. Навучы яго лавіць рыбу – і ты накорміш яго на ўсё жыццё”.

Прэцэдэнтнае імя – гэта шырока вядомае імя ўласнае, якое выкарыстоўваецца не столькі для абазначэння канкрэтнага чалавека, колькі для абазначэння сімвала пэўных якасцяў, здарэнняў, лёсаў. Спецыфікай семантыкі, якая адрознівае прэцэдэнтныя імёны ад імёнаў уласных, з’ўляецца тое, што гэтыя імёны валодаюць не толькі значэннем, але і ўжываннем з пэўным дадзеным значэннем і дадатковым асацыятыўным значэннем. Напрыклад, “Атэла мясцовага разліву” (газета «Звязда» 7 кастрычнік 2020 г., стар. 3) – артыкул пра мужчыну, які застаў сваю жонку ў гасцях узнаёмага, а загаловак мае імя, якое абазначае раўнівага мужа; “Да яго так і хацелася звярнуцца, як Гаеў у чэхаўскім “Вішнёвым садзе” да шкапы, –паважанае крэсла” (газета «Звязда» 1 кастрычніка 2021 г., стар. 15) – Гаеў звяртаўся да шкапы шчыра, лічыўшы яго захавальнікам іх сям’і на працягу стагоддзя; “Ёсць у яго постаці нешта ад героя аповесці Кузьмы Чорнага – дзядулі Насці Закрэўскай: нават у паходцы ўгадваюцца ўнутраныя інтэлігентнасць і высакароднасць” (газета «Звязда» 28 студзеня 2021 г., стар. 16) – у аповесці дзядуля высокі, храмы, з маленькай сівой барадой і валасамі, высокім лбом, арлiным носам, яснымі вачыма і нізкім голасам, горды і справядлівы; “Маё дзяцінства было падобнае на дзяцінства Якуба Коласа – бацька быў ляснік” (газета «Звязда» 30 студзеня 2021 г., стар. 8) – праводзяцца паралелі паміж дзяцінствам аўтара тэкста і дзяцінствам Я. Коласа: у абодвух бацька быў ляснік.

Як вядома, адным з самых вядомых літаратурных жанраў з’яўляюцца казкі. Менавіта таму прэцэдэнтныя імёны казачных герояў узгадваюцца ў публіцыстычных

кантэкстах: «Як рапунцэль» (газета «Звязда» 31 снежня 2020 г., стар. 18) – артыкул пра цырульню, дзе гаворка ідзе пра прыгожыя і длінныя валасы; «Адбор… Гэта як казка пра Папялушку.» (газета «Звязда» 3 студзеня 2020 г., стар. 13) – пра тое, як мужчына рыхтаваўся да палёту ў космас, нагружаны працай. Які цярпліва выконваў усё як Папялушка.

Прэцэдэнтнае выказванне – гэта адноўлены прадукт маўленчай дзейнасці, скончаная і самадастатковая адзінка; прэцэдэнтнае выказванне неаднаразова ўжываецца ў маўленні носьбітаў мовы. У прэцэдэнтныя выказванні ўваходзяць фразеалагізмы, цытаты, прыказкі, прымаўкі. Такія выказванні нясуць за сабой, або прэцэдэнтны тэкст, або прэцэдэнтную сітуацыю, або і прэцэдэнтны тэкст і прэцэдэнтную сітуацыю, якія выконваюць важную ролю ў фарміраванні сэнсу выказвання. Дзякуючы прэцэдэнтным выказванням, тэкст набывае загадкавасць, чалавек сам дадумвае сюжэт аб аб'екце, які рэкламуюць, зрабіць сваю ілюзію тавара. Гэты варыянт лепш выкарыстоўваць пры напісанні іміджавых тэкстаў, дзе аптымістычнае стаўленне да іх мэтавай аўдыторыі патрэбна. Напрыклад, «Што робіць сена на асфальце» (газета «Звязда» 1 красавіка 2021 г., стар. 16) – адсылка на твор «Сена на асфальце» М. Стральцова; «А вецер мяце, як у блокаўскай паэме "Дванаццаць", і мы ўсё больш аддаляемся ад сваёй Радзімы, і ніхто з нас не ведае "Што там наперадзе?" (А. Гарун)".» (газета «Звязда» 31 снежня 2020 г., стар. 8) – радкі з верша А. Гаруна «Думы ў чужыне»: «Што там наперадзе, што там нязнанае, што там са здзекам мяне сцеражэ?».

Прэцэдэнтная сітуацыя – нейкая «стандартная», «бездакорная» сітуацыя, звязаная з пэўнымі асацыяцыямі, якая ўключае ўяўленне аб дзеянні і аб яго удзельніках, якое ўваходзіць у кагнітыўную базу лінгвакультурнай супольнасці. Перагляд прэцэдэнтнай сітуацыі адбываецца пры яе параўнанні з тым ці іншым момантам гаворкі. Напрыклад, «А вецер мяце, як у блокаўскай паэме "Дванаццаць", і мы ўсё больш аддаляемся ад сваёй Радзімы, і ніхто з нас не ведае "Што там наперадзе?" (А. Гарун)» (газета «Звязда» 31 снежня 2020 г., стар. 8) – параўнанне ветра з ветрам у паэме «Дванаццаць» А. Блока. У гэтай паэме завязка сюжэту – заснежаныя вуліцы рэвалюцыйнага Петраграда ўзімку 1917-1918; «А разгадка будзе такая, што прымусіць успомніць ледзь не "Ваўчыную яму" Васіля Быкава.» (газета «Звязда» 4 лютага 2021 г., стар. 16) – паралелі паміж разгадкай твора В. Быкава і разгадкай знікнення дзяўчыны з экспедыцыі ў артыкуле. Прэцэдэнтная сітуацыя ўласціва кагнітыўнай свядомасці і выводзіцца на моўны ўзровень дзякуючы розным сродкам вербальнай актуалізацыі. Характар ужывання прэцэдэнтнай сітуацыі цесна звязаны з пэўнай камунікатыўнай сітуацыяй.

**Заключэнне.** Сучасныя сродкі масавай інфармацыі прапануюць высокую якасць публіцыстычных тэкстаў. У сучаснай лінгвістыцы ўдасканаленне культуры мае галоўнае пытанне – гэта захаванне традыцый і прымяненне новых ідэй. Экспрэсіўнасць мовы і паўната выкарыстання прэцэдэнтнасці ў тэкстах з'яўляецца паказчыкам культуры нацыі. Намі было выяўлена, што прэцэдэнтныя феномены літаратурнага паходжання адыгрываюць важную ролю ў стварэнні публіцыстычных тэкстаў, валодаюць вялікім вобразна-выяўленчым патэнцыялам і выкарыстоўваюцца ў тэкстах з той тэмай, з якой яны семантычна звязаны. Выяўлены і прааналізаваны намі матэрыял можа быць пакладзены ў аснову слоўніка беларускіх прэцэдэнтных феноменаў. На нашу думку, даследаванне варта працягнуць на матэрыяле мастацкага дыскурсу, што дазволіць зрабіць вывады пры асаблівасць моўнай рэпрэзентацыі прэцэдэнтных феноменаў літаратурнага паходжання.

1. Гудков, Д.Б. Некоторые особенности функционирования прецедентных высказываний / Д.Б. Гудков // Вест. Моск. ун-та. 1997. №4 – С. 106-118.

2. Красных В.В., Гудков Д.Б., Захаренко И.В., Багаева Д.В. Когнитивная база и прецедентные феномены в системе других коммуникаций / В.В. Красных, Д.Б. Гудков, И.В. Захаренко, Д.В. Багаева // Вестник МГУ. Серия 9. Филология. 1997. №3 – С. 130-184.

3. Муратова, Е. Ю. Прецедентные феномены как смыслообразующая категория поэтического текста / Е. Ю. Муратова // Наука – образованию, производству, экономике : материалы XIX(66) Регион. науч.-практ. конференции преподавателей, науч. сотрудников и аспирантов, Витебск, 13-14 марта 2014 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2014. – Т. 1. – С. 186-187. – Библиогр.: с. 187 (42 назв.). URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/5192 (дата обращения: 09.09.2022)